**Т. Супрунчык**

# СЯМЕЙНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯК АДЗІН З СРОДКАЎ ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПАЗІЦЫІ

Мэта работы заключаецца ў вызначэнні ролі сямейных традыцый у выхаванні грамадзянскай пазіцыі маладога пакалення. Для дасягнення гэтай мэты былі сфарміраваны і паслядоўна разгледжаны наступныя задачы: сфарміраваць паняцце *сямейныя традыцыі* і *грамадзянская пазіцыя*, вызначыць уплыў сямейных традыцый на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі; адшукаць дакументальныя гістарычныя звесткі аб узнікненні шляхецкага роду Ляшкевічаў; сабраць даныя аб носьбітах прозвішча Ляшкевіч у межах радзінных сувязяў; стварыць радаводнае дрэва Ляшкевічаў і дэталёва сістэматызаваць звесткі аб членах сям'і ў генеалагічным ланцужку; стварыць архіў сямейных фотаздымкаў.

Нешматлікія дакументы, якія захаваліся, дапамаглі ўзнавіць гісторыю шляхецкага роду Ляшкевічаў Зяновічаў Альпенскіх, пачынаючы з 1515 года.

Запісы Седляра Іллі Іванавіча, 1914 г.н., які цікавіўся гісторыяй, апісваюць радаводы мачульскіх радоў і расказваюць пра пачынальніка радаводу мачульскіх Ляшкевічаў. Цікава тое, што жанчыны з роду Ляшкевічаў апошніх пяці пакаленняў не змянялі прозвішчы пры замужжы. Таму і ў радавод яны як носьбіты прозвішча таксама ўключаны.

Род Ляшкевічаў Зяновічаў Альпенскіх меў свой герб. Першая выява яго датавана 1293 г., а дакументальны запіс – 1398 годам. Увогуле "Наланч" меў некалькі выяў у розных шляхецкіх родаў, але дакладнае апісанне яго ў Ляшкевічаў Зяновічаў Альпенскіх знаходзім у архіўных дакументах.

За час працы былі вывучаны, прааналізаваны і запісаны дакументальна-гістарычныя звесткі аб узнікненні шляхецкага роду Ляшкевічаў, успаміны сем'яў роду Ляшкевічаў, было створана генеалагічнае дрэва, знойдзена выява герба, створаны фотаархіў.

Стварэнне радаводу сваёй сям'і ці вядомых людзей Беларусі можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай літаратуры ці гісторыі як сродак фарміравання грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў.